УДК 821.161.3.09

*Л. М. Папова* (Магілёў, Беларусь)

# *“АСУДЖАНЫ Я ЛЮБОЎЮ ПАЖЫЦЦЁВА...”*
## (Літаратурна-музычная кампазіцыя да 100-годдзя са дня нараджэння Аркадзя Куляшова)

*Literatury-musical composittion devoted $100^{h}$ anniversary of A.Kuleshov. The given maferial can be used in educational process.*

архив библиотеки МГУ имени

Ва ўмовах сучасных тэндэнцый гуманізацыі і дэмакратызацыі адукацыі, станаўлення ў сувязі з гэтым новага педагагічнага мыслення, намеры педагагічнай грамадскасці знаходзяць сваё ўвасабленне ў рэалізацыі ідэй "педагогікі супрацоўніцтва", у якіх адлюстраваны і сканцэнтраваны новыя накірункі педагагічнай тэхнікі педагога і выхаванца.

Супрацоўніцтва – гэта такі стан узаемаадносін, пры якіх аб'екты і суб'екты аб'ядноўваюцца ў агульнай дзейнасці адносінамі таварыства, узаемапавагі, узаемадапамогі, калектывізму; гэта сумесная развіваючая дзейнасць, замацаваная ўзаемапаразуменнем, пранікненнем у духоўны свет адзін аднаго. Такое супрацоўніцтва было арганізавана для падрыхтоўкі да святкавання 100-гадовага юбілею беларускага класіка, нашага земляка А.А. Куляшова. Кіраўніком і арганізуючым цэнтрам калектыву для падрыхтоўкі вечарыны стала дырэктар Магілёўскай бібліятэкі імя К. Маркса Г.І. Краўчанка. У працы над сцэнарыем прымаў удзел калектыў бібліятэкі, Я. Дудкіна (гарадскі цэнтр культуры), В. Рачыкаў (УК "Магілёўская капэла"), вучні школы мастацтваў № 5, кампазітар М. Яцкоў, а таксама студэнты В. Аніськова, В. Старасценка і дацэнт Л.М. Папова (УА "МДУ імя А.А. Куляшова").

Мерапрыемства праходзіла ў Магілёўскай гарадской ратушы. Гледачамі былі ветэраны грамадскіх арганізацый, вучні школ і інш. Знамянальна, што літаратурна-музычная кампазіцыя адбылася 6 лютага 2014 г., у дзень нараджэння А.А. Куляшова.

Распрацаваны матэрыял можа быць выкарыстаны ў сярэдняй школе і ў вышэйшых вучэбных установах для паглыблення і пашырэння ведаў, як дапаўненне да асноўнай вучэбнай праграмы, для развіцця пазнавальных інтарэсаў падрастаючага пакалення. У працэсе падрыхтоўкі кампазіцыі і выступлення здзяйсняецца сувязь пакаленняў, выхаванне духоўна развітай асобы, здольнай да творчай дзейнасці ў сучасным свеце.

*Вядучы:* Сёння мы адзначаем стагаддзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. На жаль, ён ужо не з намі. Мы ж, тыя, хто наталяе прагу сваёй душы з крыніц паэзіі, па-ранейшаму з ім. Яна ўвайшла ў сэрцы чытачоў, як светлы і чысты Храм Паэзіі, той храм, што заўсёды вабіў да сябе Аркадзя Куляшова і ў якім нам так хораша, цёпла, утульна. Тайна нараджэння паэзіі, як і тайна нараджэння чалавека, – загадкавая. Каб яе разгадаць, трэба пазнаць краіну, душу народа, прыроду, падыхаць тым паветрам.

Выконваецца верш "Ёсць у паэта свой аблог цалінны" [3, с. 57], славесны тэкст гучыць на фоне музыкі І. Лучанка "Успамін"і суправаджаецца дэманстрацыяй слайдаў.

*Гучаць званы і плач дзіцяці, на іх фоне – словы вядучага*: Там, дзе ад веку сыходзяцца землі трох народаў: рускага беларускага і ўкраінскага,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на Магілёўшчыне, у вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна, 6 лютага 1914 года у сям'і настаўнікаў нарадзіўся Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў. Бацька яго, Аляксандр Мікалаевіч, родам з Аршаншчыны, атрымаўшы званне настаўніка ў Багародску пад Масквой, вярнуўся настаўнічаць на Мсціслаўшчыну. Маці, Кацярына Фамінічна, паходзіла з Крычаўскага павета, атрымала званне настаўніцы ў Магілёве. Бацька нядрэнна спяваў, нават некаторы час удзельнічаў у народным хоры. Была слыннай пявунняй і маці. Гэты песенны генетычны код не раз выяўляўся ў паэзіі А. Куляшова. Пасля заняткаў у школе маці бралася за звычайную сялянскую працу. У хаце спяваў калаўрот і пахла лёнам, грукаталі кросны. Увесну пад вокнамі слаліся сцежкі палотнаў, вытканых зімой. Калі тканіны станавіліся белымі, з іх шылі сарочкі дзецям. Тады Аркадзю было 3-4 гады. Дзяцінства яго прайшло каля берагоў Бесядзі. Гэта рака пралегла не толькі праз многія мясціны Беларусі, але і праз душу паэта. Яна калыхала яго найлепшыя мары і спадзяванні. Калі А. Куляшоў пісаў пра зямлю, дзе нарадзіўся, прыгадваў сваё першае каханне і, канечне ж, яе, Бесядзь, – раку маленства.

Чытаецца верш "Мая Бесядзь" [1, с. 210], які суправаджаецца харэаграфічным нумарам у выкананні вучняў гарадскога цэнтра культуры.

*Вядучы:* Першае знаёмства з пісьменнікамі ў маленькага Аркадзя адбылося раней, чым знаёмства з літарамі азбукі. У рукі хлопчыка трапіў альбом з партрэтамі рускіх пісьменнікаў, атрыманы як дадатак да часопіса, які выпісвалі бацькі. Пушкін, Лермантаў, Някрасаў... З гэтых імёнаў пачынаецца самастойнае чытанне Аркадзя. Аднойчы Аляксандру Мікалаевічу падарылі кнігу Янкі Купалы "Шляхам жыцця", і адразу гэтая кніга стала для дзесяцігадовага хлопчыка хатняй рэліквіяй. Свае першыя вершы ён склаў ужо ў шасцігадовым узросце. А надрукаваў іх – у дванаццаць гадоў. А ў чатырнаццаць – было першае каханне да чароўнай, тоненькай смуглянкі Аляксандры Карыткінай. Родам яна была з суседняй вёскі. Усе называлі яе Сашай ды Аляксандраю, а Аркадзь называў Алесяю. Сваё каханне да дзяўчыны ён выказаў у цудоўных радках верша "Бывай". Сёння гэты твор – адзін з шэдэўраў беларускай інтымнай лірыкі.

Лёс раз'яднаў два любячыя сэрцы. Пасля школы Аляксандра Карыткіна паехала ў Пецярбург і паступіла ў педагагічны інстытут, выйшла замуж. У 1938 годзе юнакі пачалі перапісвацца. Ён дасылаў ёй свае новыя творы, але ці даслаў той адзіны верш?... Усё жыццё вобраз Алесі прысутнічаў ў паэзіі Куляшова як вобраз першага кахання, яна стала сімвалам чысціні, светлай маладой тугі і юнацкіх мар.

Адышла юнацкая пара. У шаснадцать гадоў Аркадзь надрукаваў сваю першую кнігу. Скончыў тэхнікум, літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А ў 1934 годзе на вечарыне ў пісьменніка Платона Галавача ён сустрэў і закахаўся ў Ксенію Вечар. Яны ажаніліся. Шчаслівая пара! Маладыя, прыгожыя, нічым не абцяжараныя, яны жылі, як бедныя студэнты, спадзяваннямі на будучыню і цешыліся новым, невядомым для іх шчасцем. У студзені 1936 года ў іх нарадзілася дачка, праз два гады сын.

Набыццё асабістага шчасця натхняе паэта на пяшчотную лірыку. Як жывыя, родныя бары і ельнікі, рачулкі і сажалкі ўвайшлі ў паэзію Куляшова.

Верш «Радасна і сумна шалясцяць асіны" [2, с. 18]. Далей спявае магілёўскі кампазітар Мікалай Яцкоў. Потым гучыць фанаграма на песню "Балада аб маці" [1, с. 170].

*Вядучы:* Пачалася Вялікая Айчынная вайна. У другой палове ліпеня А. Куляшова накіравалі ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам. Першага жніўня ў званні капітана паэт быў залічаны літаратурным супрацоўнікам армейскай газеты «Знамя Советов» 11-й дзейснай арміі Паўночна-Заходняга фронту, дзе і праслужыў самыя цяжкія часы. Ён на ўласныя вочы пабачыў усё нязмернае гора, суцэльныя руіны гарадоў і вёсак, горкія страты. Свае пачуцці ён выказаў у вершах: "Ліст з палону","Над брацкай магілай, "Балада аб чатырох заложніках", "Камсамольскі білет."

*Гучыць урывак з верша «Ліст з палону»* [1, с. 165].

За час вайны паэт узняўся да вышынь творчасці, яго імя і творы набылі ўсесаюзную вядомасць. За паэму "Сцяг брыгады" ў 1946 ён быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР, у 1949 за паэму «Новае рэчышча» – Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Гучыць фанаграма песні І. Лучанка "Успаміны."

*Вядучы:* Пасляваенны час для Куляшова – час новых пошукаў і новага ўзыходжання. Душэўнае жыцце паэта адкрываецца нам ў новай якасці. І ўсё ж нягледзячы на шэраг творчых удач з 1956 па 1960 гг. паэт не надрукаваў ніводнага арыгінальнага верша. У той час у яго душы адбывалася істотная пераацэнка ранейшых каштоўнасцей, фарміраванне новых ідэалаў, што прадвызначалася іншай грамадскай атмасферай. Асабістая дружба з А.Твардоўскім добра паўплывала на А.Куляшова.

*Гучыць песня "Песня лістаносца" ў выкананні кампазітара М. Яцкова* [1, с. 97].

У 1968 А. Куляшоў узнагароджаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі., у 1970 – Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы. Яго лічылі жывым класікам літаратуры.

*Песню "Магілёўская хмарка"спявае кампазітар М. Яцкоў* [1, с. 138]. *Гучыць запіс званоў, плач дзіцяці і жалобная музыка.*

*Вядучы:* Раптоўная смерць 4 лютага 1978 года абарвала паэтычны маналог мужнага паэта, мысліцеля і грамадзяніна, але ў яго творах



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

назаўсёды засталіся жыць створаныя ім вобразы – жывая памяць пра гераічнае мінулае. У творах навечна застаўся з намі і вобраз паэта, які ўзбагаціў беларускае мастацкае слова новым сэнсам. У знак пашаны і прызнання творчасці класіка беларускай літаратуры Магілёўскаму педагагічнаму інстытуту было прысвоена яго імя. Адна з вуліц Магілёва носіць яго імя. Сёння, у дзень стагоддзя з дня нараджэння паэта, выйшла паштовая марка, прысвечаная А. Куляшову.

*"І кружыцца планета Куляшова, / І песня пра Алесю ўсё гучыць"* [4. С. 324], *– напісаў П. Панчанка. І гэта так.*

*У канцы літаратурна-музычнай кампазіцыі артыст Магілёўскай філармоніі Вячаслаў Рачыкаў выконвае песню "Алеся" [5. С. 4].*

**Літаратура:**


1. *Куляшоў, Аркадзь.* Збор твораў. У двух тамах / Аркадзь Куляшоў. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. – Т. 1. – С. 397.
2. *Куляшоў, Аркадзь.* Збор твораў у чатырох тамах / Аркадзь Куляшоў. – Мінск: Беларусь, 1966. – Т. 1. – С. 380.
3. *Куляшоў, Аркадзь.* Збор твораў у чатырох тамах / Аркадзь Куляшоў. – Мінск: Беларусь, 1966. – Т. 3. 1966. – С. 456. – 1967.
4. *Панчанка, Пімен.* Збор твораў у 4 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. – 343 с. Т. 3.
5. *Куляшоў, А.А.* Збор твораў: у 5 т. Т. 1 / А. Куляшоў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – 530 с.
6. *Аркадзь Куляшоў* / авт. П.Е. Панченко, сост. В.А. Кулешова. – Мн.: Беларусь, 1985. – 79 с.
7. *Бярозкін, Р.* Аркадзь Куляшоў: нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін – Мн.: Народная асвета, 1978. – С. 192.
8. *Голуб, Т.С.* Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова / Т.С. Голуб. – Мн.: Беларуская навука, 2014. – С. 374.
9. *Грынчык, Мікола.* Аркадзь Куляшоў. Крытыка-біяграфічны нарыс / Мікола Грынчык. – Мінск: Беларусь, 1964. – С. 158.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова